# У Баку прайшоў чацвёрты Беларуска-Азербайджанскі бізнес-форум па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях

5 снежня ў г. Баку (Азербайджанская Рэспубліка) прайшоў чацвёрты Беларуска-Азербайджанскі бізнес-форум па інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях.

Прывітанне Міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Канстанціна Шульгана ўдзельнікам форуму зачытаў Сяргей Жарнасек, начальнік упраўлення ААЦ пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У ім, у прыватнасці, гаворыцца, што форум з'яўляецца эфектыўнай дыялогавай пляцоўкай, на якой можна абмеркаваць актуальныя пытанні, сумесна выпрацаваць стратэгічныя рашэнні і вызначыць актуальныя напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва.

Ад Міністэрства транспарту, сувязі і высокіх тэхналогій Азербайджанскай Рэспублікі прысутных вітаў намеснік Міністра Эльмір Велізадэ.

Беларускія і азербайджанскія эксперты выступілі ў тэматычных секцыях «Перспектывы развіцця галіны сувязі» і «Лічбавая трансфармацыя». У першай секцыі свае даклады прадстаўнікі ўдзельнікі з РУП «Белтэлекам», ТАА «Ньюлэнд», РУП «НЦАТ», ТАА «Азтэлекам», ТАА «Бакінская тэлефонная сувязь», Дзяржаўнага кіравання радыёчастот; у другой секцыі - РУП «Белпошта», РУП «НЦЭУ», ААТ «Гіпрасувязь», НІРУП «ІППС», Інфармацыйна-вылічальны цэнтр, ТАА «Азерпошт».

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/06-12-2018-3805*